карысталіся дапамогай ваенных асобаў ці міліцыі [2, Ф.354.В. 1. Спр.39. с. 21]. Нягледзячы на існыя правілы ажыццяўлення рэквізіцыі маёмасці, патрабаванні юрыдычнай законнасці правядзення, агенты ня рэдка злоўжывалі сваім становішчам.

Парадак вырашэння «мэблевых» справаў, можна апісаць наступным чынам: мэбля, якая ставілася на ўлік, канфіскавалася, захоўвалася на спецыялізаваных складах. Прыватныя асобы ці ўстановы падавалі хадайніцтва ў Жыллёвы аддзел з прашэннем аб перадачы ім у карыстанне пэўнай мэблі; справа разглядалася, і калі заяўнік меў права на атрыманне мэблі, а таксама пры наяўнасці яе на складзе, прашэнне задавальнялася. Для атрымання мэблі выдаваліся ордэры «на часовае асабістае карыстанне» [2, Ф.354.В. 1. Спр.77. с. 16].

У ажыццяўленні мэблевых пытанняў савецкія працаўнікі, як сацыяльная група, знаходзіліся ў пэўным прывілеяваным становішчы. Гэтай групе жыхароў горада маглі пакінуць рэчы звыш нормы, акрамя таго нацыяналізаваная адмысловая і мастацка вартасная мэбля трапляла, першапачаткова ў іх кватэры. У якасці абгрунтавання фігуруе простае – «як савецкаму працаўніку» [2, Ф.354. О.1. Спр.39. с.4].

### Літаратура


1. *Барташевич А.А., Аладова Н.И., Романовский А.М.* История интерьера и Мебели. Мн.2002
2. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці
3. *Кобозева А.В.* Культурно-антропологический анализ повседневной жизни Москвы: социальные эксперименты первого послевоенного десятилетия. Автореф.дис. М.2004
4. *Леантовіч І.А.* Жыллё рабочых г. Мінска ў даваенны перыяд (1917 – 1941гг.)// Весці Акадэміі Навук Беларускай ССР №1 1974. Серыя грамадскіх навук. С. 104-112
5. *Лебина Н.Б.* Повседневная жизнь советского города: Нормы и аномалии 1920-1930 гг. СПб. 1999
6. Паўсядзённае жыццё Менску ў 1918-1938 гг. Дакументальныя сьведчаньні й успаміны.// Спадчына № 2-3 2003
7. *Песоцкий А.Н.* Мебельное дело. М. 1929.
8. Статистический ежегодник БССР. Мн. 1926.


## ТЭХНАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ВЫШЫЎКІ


**Дз. А. Моніч**


Шыццё і нераздзельная з ім вышыўка адносяцца да найстаражытнейшых заняткаў чалавека. Узнікненне шыцця адносіцца да эпохі першабытна-абшчыннага ладу і непасрэдна звязана з неабходнасцю выраблять адзенне: спачатку са скур, а з вынаходствам ткацтва – з тэкстылю. Удасканаленне

прылад шыцця ад каменнага, касцянога шыла да жалезных і стальных іголак мела вынікам паступовае яго ўскладненне і зараджэнне на гэтай аснове вышыўкі [3, ст. 16].

Удасканаленне тэхнічных сродкаў вышыўкі, арнаментальных форм, каларыстычных і іншых прыкмет праходзіла разам з развіццём прадзення, ткацтва, пляцення, фарбавальнай справы; залежала таксама ад сацыяльна-эканамічных умоў, этнічных традыцый, рэлігійных вераванняў [5, ст. 122]. Першыя прылады шыцця з'яўляюцца ў познім палеаліце. З іклаў маманта выразаліся статуэткі жанчын, выявы жывёл, птушак і рыб, чурынгі з ячэістым арнаментам, бранзалеты. У побыце былі касцяныя праколкі, іголкі, кінжалы, рагавыя жэзлы і інш., пацеркі з ракавін [2, ст. 12].

Аб вышываным адзенні ўсходніх славян VI – IX стст. даюць уяўленні сярэбраныя літыя мужчынскія фігуркі. Рэльефныя скульптуры малых форм, якія прызначаліся для вышывання на тканіну ці скуру, апрануты ў падпяразаную кашулю з доўгімі рукавамі і штаны [3, с. 17].

Значнай крыніцай па даследаванню вышыўкі ў IX – XIII стст. з'яўляюцца скураныя вырабы. Гэта тлумачыцца тым, што скура больш трывалы матэрыял і захоўваецца даўжэй, чым тканіна. На тэрыторыі Беларусі арнаментаваная скура прадстаўлена вырабамі гарадскіх рамеснікаў – абуткам, кашалькамі, футлярамі, ножнамі. Чаравікі ўпрыгожваліся разнастайным арнаментам з каляровых шарсцяных нітак. [1, с. 259]

Устойлівая традыцыя аздаблення адзення бісерам прасочваецца і ў IX–XV стст. Для расшывання адзення ўжываліся бронзавыя, сярэбраныя, нярэдка залочаныя бляшкі. Чатырохвугольныя металічныя бляшкі з рэльефным рысункам, іншы раз аблямаваныя дробнымі шклянымі пацеркамі, – частыя знаходкі ў каменных магілах Беларускага Панямоння [3, с. 23].

У канцы XVIII – пачатку XIX стст. з развіццём адыходніцтва, з узмацненнем сувязі з горадам і ўплыву гарадской культуры патрыярхальны быт сельскага насельніцтва хутка разбураўся, што адбілася на традыцыйным адзенні, спосабах і характары арнаментацыі народных тканін [5, с. 122].

У XIX ст. вышыванне на Беларусі было адным з пашыраных заняткаў, а вышыўка – развітым і папулярным відам народнага мастацтва. У той ці іншай ступені ёю валодала кожная жанчына, тым больш што ў асобных месцах вышыўка была адзіным ці пераважным (у параўнанні з ткацтвам) спосабам аздаблення і арнаментацыі тканін.

Для беларускай народнай вышыўкі характэрны вялікі набор тэхнічных прыёмаў, большая частка якіх ужывалася выключны для арнаментацыі асновы. Вылучаецца таксама цікавая група традыцыйных злучальных і

краявых швоў. Першыя выкарыстоўваліся для злучэння канструктыўных частак: полак фартуха, абруса, дэталей кашулі. Другія служылі для абкідання зрэзу тканіны, краёў вырабу, скразных дзірак у ажурным шыцці [3, с. 83]. Асаблівай разнастайнасцю спосабаў і дэкаратыўнымі якасцямі вылучаецца палескае абкіданне, якім аздаблялі наміткі, падолы кашуль, фартухоў, краі каўняроў і каўнерцаў. Лакальныя назвы гэтага прыёму – зубленне, зубкаванне [5, с. 12].

Па тэхніцы выканання беларускія народныя швы падзяляюцца на дзве групы: верхашвы па цэлай тканіне і скразныя, для якіх выцягваецца пэўная колькасць ніток асновы і ўтка. Швы па цэлай тканіне ў сваю чаргу дзеляцца на лічаныя (выконваюцца па ліку ніток тканіны) і адвольныя (па контуры) [3, с. 83].

Сярод лічаных (лікавых) швоў па цэлай тканіне адно з цэнтральных месц займае вышыўка наборам. Яна ўпрыгожвае ручніковыя галаўныя ўборы, кашулі, фартухі, ручнікі. Вышыўка ўяўляе сабой арнаментальную палоску – бардзюр, утвораны пэўнай калькасцю радоў шва «ўперад іголку». У канцы XIX – пачатку XX ст. вышыўка наборам пераважала сярод іншых відаў лічаных аздабляльных швоў на Палессі, была добра вядома ў Падняпроўі, бытавала ў паўночнай і заходняй частках Беларусі [5, с. 83 – 84].

У комплексе традыцыйных прыёмаў прыкметнае месца займае група гладзевых швоў. Здаўна на тэрыторыі Беларусі ўжывалася двухбаковая лічаная гладзь (насціл, высціланне, гладзь). Асаблівая папулярнасць гэтага віду гладзі адзначана ў Падняпроўі [3, с. 85]. Была вядома і тэхніка аднабаковай лічанай гладзі з паралельнымі шыўкамі. Вольнай гладдзю вышываюць узоры пераважна расліннага характару (рознакаляровымі ніткамі па контуру). Гэтая вышыўка распаўсюдзілася на Беларусі адносна позна ў параўнанні з традыцыйнымі відамі швоў.

Здаўна выкарыстоўвалася ў беларускай вышыўцы і двухбаковае шыццё роспісам, хаця шырокае распаўсюджанне для яго не характэрна. У якасці асноўнага тэхнічнага прыёму двухбаковае шыццё чырвонай бавоўнай сустракалася ў Паўночным рэгіёне, дзе ім выконвалі старажытныя міфалагічныя сюжэты з дрэвам жыцця, птушкамі, характэрнымі антрапаморфнымі персанажамі [3, с. 86–87].

Музейныя калекцыі, экспедыцыйныя матэрыялы паказваюць, што ў канцы XIX – першых дзесяцігоддзях XX ст. асаблівую папулярнасць ва ўсіх рэгіёнах мела шво крыжам [3, с. 88]. Параўнальная лёгкасць і хуткасць выканання вышывак крыжам з'явілася адной з прычын паступовага выцяснення старажытных відаў вышывання і ўзорыстага ткання.

Апрача асноўных аздабляльных швоў па цэлай тканіне выкарыстоўвалася група швоў, якія ўмоўна можна назваць дапаможнымі.

Яны ўжываліся для лінейнага, звычайна кантрастнага (чорнага, сіняга) абрамлення арнаментальных палосак [3, с. 89].

У параўнанні з вышываннем па суцэльнай тканіне ажурнае шыццё (сакаленне, гафтаванне, гафт, расшыванне, строчка) не атрымала асаблівага развіцця і найчасцей сустракаецца сярод насельніцтва ўсходніх рэгіёнаў Беларусі.

Для абазначэння ажурных вышыванак распаўсюджанне атрымалі тэрміны «сакаленне», «гаптаванне», «расшыванне». У пачатку ХХ ст. гэтай тэхнікай упрыгожвалі («усакольвалі») спадніцы, хусткі, ручнікі. Слова «сакаленне» даўняе, спачатку яно ўжывалася толькі для абазначэння мярэжак на традыцыйных відах адзення, пасля гэты тэрмін быў распаўсюджаны і на арнаментальнае шыццё [3, с. 96].

На тэрыторыі Беларусі асноўным матэрыялам для нанясення вышываных узораў здаўна з’яўлялася льняная двухнітовая даматканка з гладкай паверхняй палатнянага перапляцення. Нягледзячы на аднатыпнасць сыравіны, тэхнічных прыёмаў вырабу, якасць палотнаў значна вар’іравалася. Яна залежала ад прызначэння тканіны, рэгіянальных і часавых традыцый. Улічваючы такія прыкметы, як таўшчыня нітак, шчыльнасць ткання, ступень адбельвання, можна ўмоўна вылучыць палатно рознай гатунковасці – тонкае, сярэдняе, грубое [3, с. 68]. Асновай для вышыўкі служылі таксама ажурныя палотны. Ад суцэльных яны адрозніваліся тым, што мелі скразныя прасветы – дробныя або буйныя – у выглядзе гарызантальных і вертыкальных палос, якія ўтваралі клетку. Такія тканіны выраблялiся з ільняной пражы – белай, часам пафарбаванай [3, с. 69]. Прамысловы тэкстыль – баваўняны, шарсцяны, шаўковы – пачаў пранікаць у сялянскі побыт беларусаў досыць позна – недзе з другой паловы ХІХ ст. У адрозненне ад рускіх губерняў, дзе найбольшым попытам карысталіся баваўняныя фарбаваныя ці набіўныя тканіны, беларусы аддавалі перавагу натуральным белым палотнам, магчыма, з прычыны таго, што яны адпавядалі колеру традыцыйнага льнянога адзення [3, с. 73].

Найстаражытнейшым матэрыялам для расшывання асновы ва ўсходніх славян з’яўлялася льняная і шарсцяная пража мясцовага вырабу, прычым у асобных месцах наглядалася пераважнае выкарыстанне льняных нітак, у другіх – каляровай шэрсці. Прасочваецца пэўная залежнасць паміж асноўным матэрыялам для вырабу адзення і матэрыялам для яго арнаментацыі. Адзенне з канапель арнаментавалася ў асноўным шарсцяной пражай, ільняныя тканіны вышываліся звычайна льнянымі ніткамі [3, с. 73]. З другой паловы XIX ст. асноўным матэрыялам для арнаментацыі тканін вышыўкай (як і ткацтвам) былі пакупныя баваўняныя ніткі –

чырвоныя, сінія, чорныя ці натуральнага белага колеру.

Традыцыйныя колеравыя вырашэнні беларускай народнай вышыўкі арыентуюцца ў асноўным на чырвоны колер. Манахромныя чырвоныя вышыўкі пераважалі, хоць часцей чырвоны колер адцяняўся кантраснымі дабаўкамі сініх, пазней – чорных нітак. Дзе-нідзе бытавала спалучэнне чырвонага з белым, чырвонага з белым і сінім, сустракалася таксама аднатоннае белае ці манахромнае чорнае або тэракотавае шыццё. Ураўнаважанасць чырвонага з чорным – характэрная рыса навейшых узораў у тэхніцы крыжыка, пік папулярнасці якіх прыпадае на пачатак XX ст [4, с. 67].

Захаванне і развіццё аўтэнтычных форм беларускай народнай вышыўкі сведчыць аб імкненні беларусаў захаваць сваю гістарычную спадчыну і перадаць нашчадкам.

### Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. Рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000-2005. – 6 т.
2. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 т. / АН Беларусі. Ін-т гісторыі («Беларусь»). Мн., 1994 – 1995. – 2 т.
3. *Фадзеева В*. Беларускі народная вышыўка. Мн., 1991.
4. Ціхановіч: Жывыя вобразы прыроды / Народнае мастацтва. Мн., 1980. №10.Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.

## ВОЕННО-ИСТОРИЧЕСКОЕ ДВИЖЕНИЕ В ТУРИСТИЧЕСКОЙ СФЕРЕ

**Д.В. Морозов**

В последние годы в нашей стране движение военно-исторической реконструкции растёт качественно и количественно. Однако, сразу следует заметить, что в данной статье речь будет идти в основном только о мероприятиях реконструкторов средневекового периода. Такие направления как реконструкция периода наполеоновских войн или Великой Отечественной Войны рассматриваться не будут.

Историческая реконструкция – это процесс, направленный на воссоздание предметов и их комплексов, а также культурных моделей (обряды, праздники) старины. Реконструирование той или иной исторической эпохи (славянская Русь, древний Рим, Скандинавия, средневековая Европа и т.д.) подразумевает под собой воссоздание одежды, вещей, бытовой утвари, оружия, доспехов, украшений и т.д. на основе научных данных с соблюдением исторических технологий и использованием материалов, аналогичных материалам реконструируемой эпохи [1].

В Англии движение подобного рода существует с начала двадцатого